74.2
Р 169
+5
Д85

Установа адукацыі
“БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ”

УДК 374.713.83-053.6:37.035.6]:398

РАЖКОВА

Людміла Леанідаўна

# ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ПАДЛЕТКАЎ СРОДКАМІ ФАЛЬКЛОРУ Ў АМАТАРСКІХ МАСТАЦКІХ КАЛЕКТЫВАХ

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

па спецыяльнасці 13.00.05 – тэорыя, методыка і арганізацыя
сацыяльна-культурнай дзейнасці

Репозиторий БГУКИ

Мінск 2007

Работа выканана на кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

| | |
|---|---|
| ***Навуковы кіраўнік*** | ***Кузьмініч Мікалай Леанідавіч,*** кандыдат педагагічных навук, прафесар, першы прарэктар УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" |
| ***Афіцыйныя апаненты*** | ***Агурцоў Мікалай Георгіевіч,*** доктар педагагічных навук, прафесар, старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" |
| | ***Валахановіч Святлана Аляксандраўна,*** кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык сектара псіхалогіі дзяржаўнага кіравання НДІ тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце РБ |
| ***Апаніруючая арганізацыя*** | УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" |

Абарона адбудзецца "22" лістапада 2007 года ў 16.30 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 09.03.01 пры УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17; чытальная зала бібліятэкі; E-mail: bguki_IC @ tut.by; тэлефон навуковага сакратара – 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў".

Аўтарэферат разасланы "19" кастрычніка 2007 г.

Вучоны сакратар савета
кандыдат педагагічных навук,
прафесар Л.І.Казлоўская

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Пашырэнне і ўзмацненне працэсаў глабалізацыі ва ўсім свеце ставяць перад нашай дзяржавай, як і перад іншымі, праблему захавання, зберажэння сваёй нацыянальнай своеасаблівасці. Менавіта гэтыя абставіны сёння істотна ўплываюць на фарміраванне этнасацыяльнага вопыту падлеткаў. Відавочным з'яўляецца тое, што ад таго, якія каштоўнасці будуць сфарміраваны ў падрастаючага пакалення, залежыць далейшае развіццё нашай этнасацыяльнай супольнасці. У гэтай сувязі фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы становіцца адной з важнейшых задач сучаснага выхаваўчага працэсу, а вывучэнне падыходаў да яе фарміравання, сродкаў, метадаў і ўмоў падаецца вельмі важным і неабходным.

На жаль, у рабоце калектываў мастацкага аматарства фальклорнага кірунку выяўляюцца неадпаведнасці паміж мэтамі і зместам дзейнасці ансамбляў і некарэктнымі адносінамі ўдзельнікаў да нацыянальнай мовы, нацыянальнай культуры і спадчыны. Іх удзельнікі наведваюць заняткі, выступаюць, але разам з тым непаважліва ставяцца да нацыянальнай мовы і элементаў традыцыйнай народнай творчасці. Гэта сведчыць аб тым, што фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору менавіта ў аматарскіх мастацкіх калектывах, пошукі эфектыўнай методыкі яе фарміравання, выяўленне педагагічных умоў павышэння эфектыўнасці яе фарміравання ў аматарскіх калектывах становяцца вельмі актуальнымі пытаннямі.

Актуальнасць праблемы, яе недастатковая распрацаванасць як у навуковай сферы, так і ў сферы практычнай дзейнасці абумовілі выбар тэмы дысертацыйнага даследавання "Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах".

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне было праведзена ў межах комплекснай навукова-даследчай праграмы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў па агульнай тэме "Беларуская народна-інструментальная культура: традыцыі і сучаснасць"; (зацверджана на пасяджэнні навуковай рады Беларускага універсітэта культуры 19 сакавіка 1996 г., пратакол № 7); і больш вузкай тэме кафедры беларускай народна-песеннай творчасці "Сцэнічнае ўвасабленне беларускага фальклору" (зацверджана на пасяджэнні навуковай рады Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў 20 лютага 2001 г., пратакол № 6).

**Мэта і задачы даследавання**

Мэтай даследавання з'яўляецца распрацоўка канцэптуальных тэарэтычных і метадычных асноў фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах.

БІБЛІЯТЭКА
Бел... ...а універсі-
тэта ... ...ацтваў
ІІІ ... 3

Рэпазіторый БГУКІ

Мэта вызначыла пастаноўку наступных задач даследавання:

- выявіць педагагічныя падыходы да фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы падлетка;
- вызначыць ролю фальклору ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці асобы падлетка, вызначыць кампанентную структуру педагагічнага патэнцыялу фальклору;
- раскрыць спецыфіку мастацка-педагагічнай дзейнасці аматарскіх мастацкіх калектываў у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору;
- вызначыць узровень сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў аматарскіх мастацкіх калектываў, выявіць педагагічныя ўмовы павышэння эфектыўнасці працэсу яе фарміравання;
- распрацаваць і апрабіраваць методыку фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах.

Аб'ект даследавання – нацыянальная самасвядомасць падлеткаў – удзельнікаў мастацкіх аматарскіх калектываў фальклорнага кірунку. Прадмет даследавання – працэс фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх калектывах мастацкай творчасці. Выбар аб'екта і прадмета даследавання абумоўлены недастатковай распрацаванасцю ў тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці спецыфікі фарміравання падрастаючага пакалення на нацыянальна культурных каштоўнасцях.

**Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Вызначаючы нацыянальную самасвядомасць як сукупнасць розных самаідэнтыфікацый асобы, якая фарміруецца на аснове своеасаблівых адносін этнічных суб'ектаў да асаблівасцей этнакультурнага свету, азначым, што сярод педагагічных падыходаў да яе фарміравання вызначальным з'яўляецца погляд, пры якім адбываецца атрыманне ведаў аб сутнасці нацыянальнага жыцця (кагнітыўны аспект), узмацненне нацыянальных па змесце пачуццяў (афектыўны аспект), далучэнне і ўключэнне асобы ў нацыянальныя па змесце віды дзейнасці (канатыўны аспект). Працягнуты ў часе працэс фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы залежыць ад шматлікіх фактараў. Сензітыўным перыядам у гэтым працэсе з'яўляецца падлеткавы ўзрост, калі інтэнсіўна працякае фарміраванне розных відаў ідэнтычнасці. Назапашаны асобай сацыяльны вопыт існавання ў пэўнай этнасацыяльнай супольнасці складваецца ў сістэму, кірунак фарміравання якой магчыма прасачыць і адкарэкціраваць.

2. Фальклорныя ўзоры ў сучасных сацыяльна-культурных умовах усведамляюцца нацыянальнай каштоўнасцю і гарантам захаванасці этнічнай своеасаблівасці і таму выкарыстоўваюцца як для кансалідацыі беларускага



народа, так і для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці яе прадстаўнікоў. Фактарамі, якія забяспечылі захаванасць і адлюстраванне ў фальклорных творах этнакультурнай інфармацыі, з'яўляюцца яго канстытуцыйныя прыметы: унутрысітуацыйнасць, вуснасць, традыцыйнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм. Менавіта яны складаюць аснову педагагічнага патэнцыялу фальклору. Акрамя таго, вялікае значэнне маюць педагагічныя ідэі, інфармацыя, код, закладзеныя ў паэтычным змесце фальклорнага твора. Удакладненне традыцыйнага погляду на педагагічны патэнцыял фальклору можа растлумачыць, якім чынам традыцыйная культура садзейнічае цэласнаму фарміраванню духоўнага свету асобы, выступае стымулам каштоўнаснага асэнсавання духоўнай культуры народа, з'яўляецца пабуджальным механізмам да суаднясення мінулага вопыту з сучаснай практыкай, якая фарміруе гістарычную памяць народа і асобы, садзейнічае ўмацаванню пачуцця нацыянальнай годнасці, патрыятызму, фарміруе нацыянальную самасвядомасць асобы.

3. Дзейнасць аматарскіх мастацкіх калектываў дазваляе комплексна выкарыстоўваць тры галоўныя складаючыя фарміравання нацыянальнай самасвядомасці (узбагачэнне нацыянальнымі па змесце ведамі, узмацненне нацыянальных па змесце пачуццяў, уключэнне асобы ў нацыянальныя па змесце віды дзейнасці). Педагагічны патэнцыял арганізаванага аматарства даволі багаты. Ён вызначаецца мэтанакіраванасцю педагагічнага працэсу, добраахвотнасцю і інтарэсамі наведвальнікаў. Усё гэта робіць аматарскі мастацкі калектыў моцным сродкам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў. Але з-за спецыфічнага праламлення фальклорнай творчасці ў дзейнасці такіх калектываў, пазначаных сродкаў недастаткова. Сцэнічны тып прэзентацыі фальклору з'яўляецца адным з асноўных у сучаснай культуры і выкарыстоўваецца ўсімі тыпамі калектываў: эксперыментальнымі, стылізатарскімі, этнаграфічнымі. Сцэна задае пэўныя абмежаванні і моцна скажае прыроду фальклору. Яна патрабуе арганізацыі ўсёй дзейнасці калектыву аналагічна сістэме навучання, прынятай у акадэмічным мастацтве. У выніку рэалізацыя выхаваўчых магчымасцей фальклору, якія закладзены, з аднаго боку, у паэтычным і музычным тэксце фальклорнага твора, а з другога – у канстытуцыйных прыметах фальклорнай творчасці (унутрысітуацыйнасць, вуснасць, традыцыйнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм), у дзейнасці такіх калектываў амаль не адбываецца, а значыць, эфектыўнасць працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў невысокая. Павышэнне яе эфектыўнасці забяспечваецца ўзаемадзеяннем і гарманізацыяй педагагічных патэнцыялаў фальклору і мастацкага аматарства ў дзейнасці калектываў.

4. Узровень сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў-падлеткаў аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку невысокі. Характарызуецца частковымі адмоўнымі сувязямі паміж яе



Репозиторий БГУКИ

структурнымі кампанентамі. Адсюль, патрабуецца мэтанакіраваная праца з удзельнікамі такіх калектываў. Педагагічнымі ўмовамі павышэння эфектыўнасці працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах з'яўляюцца: а) максімальная імітацыя канстытуцыйных прымет існавання фальклорнай культуры (унутрысітуацыйнасць, традыцыйнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм, вуснасць) у вучэбна-творчым працэсе калектываў дзеля атрымання эфекту паглыблення ўдзельніка ў фальклорную культуру і рэалізацыі педагагічных магчымасцей фальклору; б) уцягванне ўдзельнікаў у грамадска - значныя, нацыянальныя па змесце, справы мастацкага аматарскага калектыву фальклорнага кірунку, фарміраванне ў падлеткаў станоўчых адносін да гэтых спраў і іх актыўны ўдзел у мерапрыемствах.

5. Методыка фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах скіравана першым чынам на стварэнне ўмоў для фарміравання ў асобы этнічнай карціны свету, усведамлення зместу і каштоўнасці народнай культуры. Яна рэалізуецца ў мэтавым, змястоўным, працэсуальным і рэзультатыўным аспектах мастацка-педагагічнай дзейнасці аматарскага калектыву. Методыка ўключае шэраг этапаў, кожны з якіх прадугледжвае дасягненне прыватных мэт на аснове адэкватнага зместу, формаў і метадаў работы калектыву педагогаў і ўдзельнікаў. Першы этап – ***дыягнастычна-праектыўны*** – звязаны з вызначэннем пачатковага ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў (дыягнастычныя методыкі), пастаноўкай мэт і задач, мадэліравання на аснове атрыманых даных далейшага працэсу. Другі этап – ***змястоўна-працэсуальны*** – скіраваны на непасрэднае фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў калектыву ў працэсе іх мастацкай аматарскай дзейнасці. Удасканаленне працэсу на дадзеным этапе адбываецца праз удакладненне зместу рэпетыцыйных заняткаў, метадаў, сродкаў і формаў работы з удзельнікамі, праз рэалізацыю педагагічных умоў павышэння эфектыўнасці фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў, якія патрабуюць комплекснага падыходу да арганізацыі ўсіх бакоў дзейнасці аматарскага калектыву: вучэбна-мастацкай, выканальніцкай, сацыякультурнай. Трэці этап – ***рэзультатыўна-перспектыўны*** – сваёй мэтай ставіць вывучэнне дасягнутага ўзроўню сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў мастацкага аматарскага калектыву і вызначэнне перспектывы далейшай работы па яе фарміраванні.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца вынікам шматгадовай практычнай працы аўтара, яго навуковых пошукаў. Асабісты ўклад суіскальніка заключаецца ў:



1) удакладненні зместу паняцця "нацыянальная самасвядомасць", якое разглядаецца як сплаў розных самаідэнтыфікацый асобы, што фарміруюцца на базе спецыфічных адносін этнічных суб'ектаў да унікальных асаблівасцей этнакультурнага свету, на аснове чаго выяўлены педагагічныя падыходы да фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў;

2) абгрунтаванні канстытуцыйных прымет фальклору (унутрысітуацыйнасці, традыцыйнасці, калектыўнасці, сінкрэтызму, вуснасці) як адных са складальнікаў педагагічнага патэнцыялу фальклору і іх вядучай ролі ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці асобы падлетка;

3) выяўленні спецыфікі мастацка-педагагічнай дзейнасці аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў, якая абумоўлена рознай прыродай арганізаванага аматарства і фальклору, нераўназначнасцю педагагічных патэнцыялаў аматарскага мастацкага калектыву фальклорнага кірунку і фальклорнай творчасці, што прыводзіць да змен у мастацкай стылістыцы, спосабаў узнаўлення і існавання фальклорнай спадчыны;

4) вылучэнні на аснове вызначанага ўзроўню сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў педагагічных умоў павышэння эфектыўнасці працэсу яе фарміравання сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах;

5) распрацоўцы і апрабацыі методыкі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскім калектыве мастацкай творчасці.

**Апрабацыя вынікаў даследавання**

Асноўныя палажэнні дысертацыі абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедры народна-інструментальнай творчасці, кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці БДУ культуры і мастацтваў. Асноўныя навуковыя вывады і практычныя рэкамендацыі былі прадстаўлены на навуковай канферэнцыі аспірантаў "Культура Беларусі: навуковы пошук моладзі" (Мінск, 1997), міжнароднай маладзёжнай навуковай канферэнцыі "Усходнеславянскае адзінства ў мінулым, сучасным і будучыні" (Гомель, 1998), міжнароднай навуковай канферэнцыі "Тэорыя і практыка маральнага выхавання: гісторыя, сучаснасць, перспектывы" (Мазыр, 1998), навуковай канферэнцыі "Перспектыўныя накірункі навуковых даследаванняў фарміравання духоўнай і мастацкай культуры студэнтаў" (Мінск, 1998), навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў БДУК "Нацыянальная спадчына і сучасныя праблемы культуры" (Мінск, 2004), міжвузаўскай навукова-метадычнай канферэнцыі "Фарміраванне духоўных каштоўнасцей студэнтаў у працэсе засваення традыцыйнай культуры" (Мінск, 2006), Рэспубліканскай



Рэпазіторый БГУКІ

навукова-метадычнай канферэнцыі "Аўтэнтычны фальклор: праблемы бытавання, вывучэння, пераймання" (Мінск, 2007).

**Апублікаванасць вынікаў**

Матэрыялы даследавання знайшлі адлюстраванне ў 9 публікацыях аўтара, у тым ліку ў матэрыялах канферэнцый – 5; у часопісах – 4. Агульны аб'ём публікацый 2,9 аўтарскіх аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў, вынікаў па главах, заключэння, бібліяграфічнага спіса, дадаткаў. Аб'ём дысертацыі складае 104 ліста, 28 лістоў мае бібліяграфічны спіс, які ўключае 349 крыніц і 9 публікацый суіскальніка. У ёй змяшчаецца 3 табліцы і 7 малюнкаў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

У першай главе **"Педагагічныя асновы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах"** раскрываецца змест паняццяў "нацыянальная самасвядомасць падлеткаў", "фальклор", "аматарскія мастацкія калектывы". Выяўляюцца на аснове аналізу філасофскай, сацыялагічнай, псіхолага-педагагічнай, гісторыка-этнаграфічнай і мастацтвазнаўчай літаратуры сувязі паміж гэтымі паняццямі, што дазволіла выдзеліць педагагічныя падыходы да фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў.

Параграф 1.1 ***"Аналіз літаратуры і метадалогія даследавання"*** прысвечаны выяўленню сутнасці нацыянальнай самасвядомасці і эвалюцыі яе зместу ў айчыннай і замежнай навуцы. Праблемы зместу паняцця, яго структуры, метадаў, сродкаў, этапаў і фактараў фарміравання разглядаліся навукоўцамі розных галін навукі: філасофіі, псіхалогіі, этнаграфіі, гісторыі, педагогікі.

У рабоце раскрываюцца механізмы дыялектычнага ўзаемадзеяння этнакультурнага свету і індывідуальнасці, якія асабліва ярка выяўляюцца ў падлеткавым узросце, калі актыўна працякаюць працэсы фарміравання самасвядомасці (Л.С.Выгоцкі, В.С.Мерлін, С.Л.Рубінштэйн, А.Г.Спіркін, У.В.Столін, В.Ю.Хацінец).

Вынікам шматгадовых даследаванняў этнічнай самасвядомасці ў розных галінах навукі стала разуменне таго, што:

1) нацыянальная самасвядомасць з'яўляецца інтэгральным утварэннем. Яе кампаненты знаходзяцца ў заканамернай сувязі і ўзаемаадносінах адзін з



адным, утвараючы сабой розныя ўзроўні станаўлення. Першы ўзровень выражае ўяўленні аб этнакультурнай рэальнасці, а другі – этнічную ідэнтычнасць;

2) у працэсе генезісу нацыянальнай самасвядомасці змяняецца і яе структура, якая характарызуецца ўсё большай інтэнсіўнасцю ўзаемасувязей паміж кампанентамі;

3) асноўнымі псіхалагічнымі механізмамі праяўлення і развіцця нацыянальнай самасвядомасці з'яўляюцца этнафункцыянальныя працэсы ідэнтычнасці. Гэта рознага роду самаідэнтыфікацыі, якія фарміруюцца на базе спецыфічнага стаўлення этнічных суб'ектаў да унікальных асаблівасцей этнакультурнага свету;

4) развіццё этнічнай індывідуальнасці абумоўлена базавымі працэсамі этнакультурнага развіцця чалавека.

У сувязі з гэтым вывучэнне сутнасных характарыстык нацыянальнай самасвядомасці і яе функцыянавання ў сістэме этнапсіхалагічных уласцівасцей асобы дазволіла зрабіць вывад, што фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў застаецца актуальнай, мала даследаванай сацыяльна-педагагічнай праблемай сучаснасці.

Аналіз навуковых крыніц паказвае адсутнасць агульнага падыходу да структурызацыі нацыянальнай самасвядомасці асобы (А.А. Бараноеў, Ю.У.Брамлей, Г.А.Зіманас, І.А.Сняжкова, Г.Т.Тавадаў, К.Н.Хабібуллін, В.Ю.Хацінец). Менавіта асаблівасці кампанентнай структуры вызначаюць педагагічныя погляды на яе фарміраванне, што выяўлена даследаваннямі педагогаў-навукоўцаў (Л.А.Альшэўскай, Н.У. Альшэўскай, Л.М. Варанецкай, А.А.Грымаця, Д.В.Яфімавай, Л.Г.Зайцавай, К.Г.Лапіч, А.А.Міхневіча, Г.С.Сцяпанавай і інш.). У гэтым даследаванні структура нацыянальнай самасвядомасці асобы прадстаўлена наступнымі элементамі: а) веды аб сутнасці нацыянальнага жыцця; б) нацыянальныя па змесце пачуцці; в) нацыянальныя па змесце і па выніках паводзіны і ўчынкі. Скіроўваецца ўвага педагогаў на аб'ектыўных і суб'ектыўных фактарах яе фарміравання, сярод якіх немалаважную ролю адыгрываюць культурныя каштоўнасці і традыцыі, адпаведныя сацыякультурныя інстытуты. Гэта дазваляе разглядаць дзейнасць аматарскіх мастацкіх калектываў, фальклорныя традыцыі, фальклорныя ўзоры, каштоўнасці ў якасці сродкаў фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.

У параграфе 1.2 ***"Фальклор як сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці"*** раскрываецца роля фальклорнай культуры ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці асобы, выяўляюцца магчымасці выкарыстання фальклору як сродку фарміравання нацыянальнай самасвядомасці чалавека.

Зразумела, што ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя фальклор з'яўляецца адным з элементаў беларускай нацыянальнай культуры і ўяўляе сабою крыніцу



Рэпазіторый БГУКІ

нацыянальна спецыфічнага. Нацыянальная культура фіксуецца ў самасвядомасці кожнага пакалення. У сваю чаргу нацыянальная самасвядомасць вызначае пэўныя адносіны людзей да культурных набыткаў. Такім чынам нацыянальная самасвядомасць стымулюе развіццё нацыянальнай культуры. А засваенне каштоўнасцей нацыянальнай культуры выступае абавязковай умовай фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Гэта сведчыць аб тым, што пэўныя фактары садзейнічалі захаванасці і адлюстраванню ў фальклорных творах этнакультурнай інфармацыі. Гэтымі фактарамі з'яўляюцца канстытуцыйныя прыметы фальклору: унутрысітуацыйнасць, вуснасць, традыцыйнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм. Менавіта яны спрыялі таму, што захаваліся і дайшлі да нашых дзён адбіткі розных эпох, падзей, якія пераплятаюся паміж сабой і стварылі адзінае цэлае, забяспечыўшы тым самым своеасаблівы свет калектыўнай свядомасці. У фальклорнай культуры знайшлі адлюстраванне ўсе этапы этнічнага развіцця сацыяльнай супольнасці, розныя формы народнай самасвядомасці: мясцовай, сацыяльнай, рэлігійнай і этнічнай.

Аналіз педагагічнай літаратуры дае падставу сцвярджаць, што ёсць розныя падыходы ў вывучэнні і тлумачэнні выхаваўчай функцыі фальклору. Яны звязаны не толькі з выкарыстаннем асобных жанраў фальклору з мэтай спецыяльнага (працоўнага, разумовага, рэлігійнага, эстэтычнага, фізічнага, патрыятычнага) выхавання малодшага пакалення (Г.П. Арлова, У.Ф. Валадзько, Л.М. Варанецкая, Г.Н. Волкаў, А.А. Грымаць і іншыя), але і з усведамленнем магчымасці фальклорнай спадчыны выступаць сродкам цэласнай сацыялізацыі асобы (Г.А. Барташэвіч, Г. Вінаградаў, І.С. Вінаградаў, І.В. Казакова, І.І. Калачова, І.В. Суханаў і іншыя). Такі падыход дазволіў у рамках нашага даследавання ўдакладніць кампанентную структуру педагагічнага патэнцыялу фальклору. Педагагічны патэнцыял фальклорнай творчасці мы вызначаем як сукупнасць умоў і фактараў, якія аказваюць выхаваўчае ўздзеянне на асобу. Гэтую сукупнасць умоўна можна падзяліць на дзве часткі: адна з іх складаецца з педагагічных ідэй, інфармацыі, кода, заключаных у паэтычным змесце фальклорнага твора і яго ладава-меладычна-рытмічнай пабудове, а другую ўтвараюць спецыфічныя спосабы існавання традыцыйнай народнай творчасці (унутрысітуацыйнасць, вуснасць, традыцыйнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм). Менавіта гэтыя канстытуцыйныя прыметы фальклору разглядаюцца намі як вызначальныя пры адборы формаў, метадаў, сродкаў фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ў дзейнасці аматарскіх калектываў.

У параграфе 1.3 “***Педагагічныя магчымасці аматарскага калектыву мастацкай творчасці фальклорнага кірунку ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў***” разуменне педагагічнага патэнцыялу мастацкага аматарства, абумоўленага мэтанакіраванай арганізацыяй мастацка-



педагагічнага працэсу, добраахвотнасцю і інтарэсамі наведвальнікаў, а таксама эмацыянальная значнасць мастацкай творчасці ў параўнанні з яго канчатковым вынікам вызначаюць шырокія магчымасці ўплыву мастацкага аматарскага калектыву на фарміраванне ўсіх бакоў асобы падлетка, у тым ліку і на фарміраванне яго нацыянальнай самасвядомасці. Аднак сёння гэтых сродкаў недастаткова. У мастацка-педагагічнай дзейнасці аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку ёсць свая спецыфіка, якую магчыма раскрыць толькі ў параўнанні са спецыфікай фальклорнай творчасці. Яна ствараецца асаблівасцямі праламлення педагагічнага патэнцыялу традыцыйнай фальклорнай творчасці ў дзейнасці мастацкага калектыву.

Разгледзеўшы педагагічныя патэнцыялы аматарскага мастацкага калектыву фальклорнага кірунку і фальклорнай творчасці, мы прыйшлі да высновы, што яны нераўназначныя і маюць розную прыроду. У сферы дзейнасці сучаснага мастацкага аматарства фальклорныя каштоўнасці знаходзяцца ў нетрадыцыйных для іх умовах, у іншай сацыяльна-культурнай сітуацыі, што вядзе да змены іх мастацкай стылістыкі, спосабаў узнаўлення і бытавання. Існуюць пэўныя кропкі сутыкнення паміж гэтымі з'явамі. Параўнаць іх магчыма па некалькіх параметрах: па рэжыму ажыццяўлення дзейнасці, рэгламентацыі ўзаемаадносін кіраўніка і ўдзельнікаў, спосабе кіравання вучэбным працэсам з боку кіраўніка, па рэпертуарнай палітыцы, выканальніцкай і сацыякультурнай дзейнасці. Вынікам гэтага параўнання стала разуменне таго, што з акадэмізацыяй формаў мастацка-творчай дзейнасці, якая назіраецца ў фальклорна-сцэнічных калектывах, педагагічны патэнцыял фальклору не рэалізуецца з-за немагчымасці ўзнаўлення яго канстытуцыйных прымет. Пісьмовая традыцыя культуры, у межах якой працякае дзейнасць такіх калектываў, нараджае сваю мову і выпрацоўвае адпаведную сістэму яе засваення, што і абумоўлівае своеасаблівасць навучання ў такіх калектывах.

Другая глава дысертацыі **“Метадычнае забеспячэнне фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах”** раскрывае асаблівасці фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскім калектыве мастацкай творчасці праз дзейсную методыку, вынікі яе выкарыстання і ўкаранення ў практыку мастацка-педагагічных працэсаў калектываў.

Падставай для правядзення дыягнастычнага этапа даследавання з'явілася запатрабаванне ў: 1) вывучэнні ўзроўняў сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў – удзельнікаў мастацкіх аматарскіх калектываў фальклорнага кірунку; 2) выяўленні ўмоў і фактараў мастацка-педагагічнай дзейнасці калектываў, якія спрыяюць ці стрымліваюць фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы. Улічваючы складанасць паняцця



Рэпазіторый БГУКІ

“нацыянальная самасвядомасць”, яе шматграннасць, для рашэння пастаўленых задач намі былі выкарыстаны комплекс методык, куды ўвайшлі: агульны ліст апытання, пры дапамозе якога мы вывучалі тэарэтычныя веды ўдзельнікаў эксперыменту па нацыянальнай праблематыцы, іх стаўленне да тых або іншых з'яў нацыянальнага быцця, іх гатоўнасць да нацыянальна-карыснай дзейнасці; “партрэт” – разнавіднасць праектыўнай методыкі, мэтай якой было вывучэнне адносін падлеткаў да сучаснай нацыянальнай рэчаіснасці; “фактары”, пры дапамозе якой мы вывучалі набор фактараў, якія ўсведамляюцца падлеткамі – удзельнікамі фальклорных калектываў як этнаінтэграваныя (Л.А. Альшэўская); анкета дзейнасных арыентацый (Я.І. Смірнова); анкета вызначэння ўзроўню сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці (В.Ю. Хацінец). Для апрацоўкі эмпірычных даных выкарыстоўваўся пакет прыкладных праграм статыстычнай апрацоўкі STATISTIKA for Windows для персанальнага камп'ютэра.

Праведзенае дыягнастычнае даследаванне знайшло сваё адлюстраванне ў параграфе 2.1 ***“Стан нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў – удзельнікаў фальклорна-сцэнічных калектываў”.*** Яно дало падставу сцвярджаць, што сярод удзельнікаў фальклорных калектываў вельмі мала падлеткаў з высокім узроўнем сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці (18%). Вялікую частку падлеткаў (54%) складаюць удзельнікі з нізкім узроўнем, а астатнія (28%) дэманструюць сярэдні ўзровень. Як паказала даследаванне, тэарэтычныя веды традыцыйнай матэрыяльнай і духоўнай культуры ўдзельнікаў дастатковыя. Удзельнікі такіх калектываў дэманструюць веды аб належных нацыянальных паводзінах і веды аб належных нацыянальных пачуццях, але гэтыя веды не сталі стымуламі іх паводзін. Як паказаў аналіз дзейнасных арыентацый ўдзельнікаў фальклорных калектываў, нацыянальна значная дзейнасць апынулася на апошнім месцы сярод іншых дзейсных арыентацый.

Уключанае назіранне за рэпетыцыйнымі заняткамі ў эксперыментальных калектывах, аналіз гутарак з кіраўнікамі калектываў і іх удзельнікамі дазволілі зрабіць вывад аб пэўных цяжкасцях у арганізацыі працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Гэты працэс адбываецца стыхійна, без уплыву з боку кіраўніка мастацкага калектыву. Такое становішча выклікана радам прычын: 1) кіраўнікі не маюць канкрэтнага ўяўлення аб змесце паняцця "нацыянальная самасвядомасць", не могуць вызначыць пачатковы этап гэтага працэсу, формаў і метадаў працы ў дадзеным кірунку; 2) імкненне да “знешняга прафесіяналізму”, па прычыне чаго ўвесь рэпетыцыйны час падпарадкаваны выпрацоўцы спецыяльных навыкаў, здольных выклікаць уражальны эфект на сцэне, актыўная выканальніцкая дзейнасць; 3) неразуменне кіраўнікамі мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку педагагічнага патэнцыялу традыцыйнай народнай творчасці, розніцы паміж педагагічным патэнцыялам фальклору і педагагічным патэнцыялам мастацкага аматарства; 4) адсутнасць у



дзейнасці мастацкіх калектываў нацыянальных па змесце грамадска-карысных спраў.

Даследаванне мастацка-педагагічнай дзейнасці аматарскіх калектываў дазволіла нам вызначыць педагагічныя ўмовы, якія спрыяюць значнаму павышэнню эфектыўнасці працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў мастацкага аматарства. Сярод іх мы вылучаем агульныя педагагічныя ўмовы: 1) узаемадзеянне мастацкага аматарскага калектыву, сям'і і школы ў цэласным выхаваўчым працэсе, які ўключае ў сабе фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці; 2) арганізацыю мастацка-педагагічнага працэсу з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей падлеткаў. Спецыяльнымі педагагічнымі ўмовамі павышэння эфектыўнасці працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы ў дзейнасці мастацкіх аматарскіх калектываў з’яўляюцца: 1) максімальная імітацыя канстытуцыйных прымет фальклорнай культуры (унутрысітуацыйнасць, традыцыйнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм, вуснасць) у вучэбна-творчым працэсе калектываў для атрымання эфекту поўнага пагружэння ўдзельніка ў фальклорную культуру і рэалізацыі педагагічных магчымасцей фальклору; 2) уцягванне ўдзельнікаў у грамадска значныя справы мастацкага аматарскага калектыву фальклорнага кірунку, фарміраванне ў падлеткаў станоўчых адносін да гэтых спраў, актыўны ўдзел у іх.

У параграфе 2.2 ***“Методыка фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў – удзельнікаў мастацкіх самадзейных калектываў фальклорнага кірунку”*** раскрываецца сутнасць распрацаванай аўтарам методыкі, якая заснавана на ўліку ўзроставых асаблівасцей падлеткаў, спецыфікі існавання фальклору ў сучасных сацыякультурных умовах і арганізацыі мастацка-адукацыйнага працэсу ў аматарскім калектыве, а таксама адлюстроўваюцца вынікі фарміруючага эксперыменту па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў.

Методыка фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў мастацкага аматарскага калектыву ўключае шэраг этапаў, кожны з якіх прадугледжвае дасягненне прыватных мэт на аснове адэкватнага зместу, форм і метадаў работы педагога.

Першы этап – дыягнастычна-праектыўны. Ён прадугледжвае вырашэнне наступных задач: выяўленне пачатковага ўзроўню сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці нашых удзельнікаў калектыву пры дапамозе дыягнастычных методык, аналіз мастацка-педагагічнага працэсу калектыву з мэтай вызначэння кірункаў яго ўдасканалення ў арганізацыйным і змястоўным плане, мадэляванне на аснове атрыманых дадзеных далейшага мастацка-педагагічнага працэсу. Гэты этап з'яўляецца вельмі важным у прадвызначэнні далейшай рэалізацыі методыкі.



Репозиторий БГУИР

Другі этап – змястоўна-працэсуальны – скіраваны на непасрэднае фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў калектыву ў працэсе іх мастацкай аматарскай дзейнасці. Характарызуецца працягласцю рэалізацыі. Цяжкасці яго заключаюцца ў тым, што трэба ўлічваць шмат складаемых. Рэалізацыя педагагічных умоў павышэння эфектыўнасці фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў патрабуе комплекснага падыходу да арганізацыі рознастароннняй дзейнасці аматарскага калектыву: вучэбна-мастацкай, выканальніцкай, сацыякультурнай. Змястоўны яго аспект патрабуе ўвядзення ва ўсе віды работы калектыву этнарэгіянальных асаблівасцей традыцыйнай культуры падсістэм этнічнай культуры: вытворчага кампанента жыццезабеспячэння (вопратка, жыллё, ежа), сацыянарматыўнага (этнічны светапогляд, норавы, традыцыі, звычаі і абрады, рэлігія і вераванні), пазнавальнага (нацыянальная мова, гісторыя свайго народа, роднай краіны, народная творчасць, нацыянальная літаратура і мастацтва) і іншых патрэбных дадатковых этнічных ведаў. Працэсуальны аспект прадугледжвае сістэму формаў, сродкаў, метадаў для дасягнення рэалізацыі ўмоў фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў аматарскага калектыву: даступнасць інфармацыі па нацыянальных асаблівасцях свайго народа, далучэнне ўдзельнікаў да дасягненняў і набыткаў свайго народа (наведванне краязнаўчых музеяў, нацыянальных выстаў, нацыянальных тэатраў і калектываў), правядзенне сустрэч з творчай інтэлігенцыяй, навуковымі супрацоўнікамі, носьбітамі фальклорнай культуры, арганізацыя і ўдзел у нацыянальных святах і абрадах, укараненне нацыянальных традыцый у калектыў; міжкультурная праграма, накіраваная на разуменне адрозненняў і на ўсведамленне падабенства культур, адзінства агульначалавечых каштоўнасцей. Для дасягнення пастаўленай мэты выкарыстоўваюцца традыцыі, звычаі і абрады з іх складаным узаемадзеяннем усіх жанраў фальклору песеннага, харэаграфічнага, музычнага, гульнявога, дэкаратыўна-прыкладнога і малых формаў вуснай творчасці, а таксама глыбінёй і складанасцю сэнсаў, багаццем сімвалічнасці. Яны рэалізуюцца ў працэсе рэпетыцыйных заняткаў, канцэртнай выканальніцкай дзейнасці, даследчай работы ўдзельнікаў, сацыякультурнай дзейнасці.

На гэтым этапе кіраўніком калектыву развіваліся здольнасці ўдзельнікаў да ўсведамлення сябе прадстаўнікамі пэўнага народа, ствараліся ўмовы для пераадолення негатыўнага і абыякавага стаўлення ўдзельнікаў да нацыянальных сімвалаў і каштоўнасцей, выхавання паважлівых адносін да народных традыцый, традыцый другіх культур, выпрацоўваліся навыкі станоўчых міжнацыянальных зносін, вялася мэтанакіраваная работа па фарміраванні ў наведвальнікаў калектыву нацыянальных пачуццяў.

Трэці этап – рэзультатыўны – сваёй мэтай меў вывучэнне дасягнутага ўзроўню сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў



мастацкага аматарскага калектыву і праектаванне далейшай работы па яе фарміраванні.

Атрыманыя даныя далі падставу канстатаваць, што змены ў нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў калектываў фальклорнага кірунку назіраюцца як у эксперыментальным, так і ў кантрольных калектывах. Аднак змены ў бок больш гарманічнага стану нацыянальнай самасвядомасці, які мы вызначаем як высокі ўзровень сфарміраванасці, у эксперыментальным калектыве з'яўляюцца больш выразнымі.

**Табліца 1.** ***Дынаміка фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку на пачатку і пасля фарміруючага эксперыменту***

| № п/п | Групы | Узроўні сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў, % | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | высокі | | сярэдні | | нізкі | |
| | | *1 зрэз* | *2 зрэз* | *1 зрэз* | *2 зрэз* | *1 зрэз* | *2 зрэз* |
| 1 | Эксперыментальная | **8** | **15** | 31 | **62** | 61 | **23** |
| 2 | Кантрольная | 20 | **29** | 29 | **44** | 51 | **27** |

У адпаведнасці з адзначаным рэалізацыя выяўленых педагагічных умоў павышэння эфектыўнасці фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў у аматарскім калектыве мастацкай творчасці сродкамі фальклору і выкарыстанне адпаведнай методыкі прыводзяць да больш станоўчых вынікаў. Такім чынам, дадзеныя заключнага этапа дыягностыкі эксперыментальнай групы паказалі на пэўныя зрухі ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці яе ўдзельнікаў. Яны праявіліся ў павелічэнні колькасці падлеткаў з больш гарманічным станам яе сфарміраванасці (сярэдні і высокі яе ўзровень). Метад статыстычных гіпотэз – крытэрый Пірсана – паказвае, што розніца паміж першым (канстатуючым) і другім (кантрольным) вымярэннем ляжыць у зоне значнасці $\chi^2$эмп = 8,28.

$\chi^2$эмп $\geq \chi^2$кр

$\chi^2$кр = 5,991 ($\rho \leq 0{,}05$)
9,210 ($\rho \leq 0{,}01$).

Змены ў нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў можна лічыць верагоднымі. Розніца паміж двума размеркаваннямі лічыцца верагоднай, калі $\chi^2$эмп дасягае, ці перавышае $\chi^2$кр 0,05. У сувязі з гэтым прадуктыўнасць распрацаванай намі методыкі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці



Репозиторий БГУКИ

падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскім калектыве мастацкай творчасці выяўляецца ў пазітыўных зменах у структуры нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў, пацвярджаецца атрыманымі колькаснымі паказчыкамі і праведзенымі статыстычнымі разлікамі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ
### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Нацыянальная самасвядомасць асобы прадстаўляе сабою складанае структурнае ўтварэнне, якое разглядаецца як вынік культурнай самаідэнтыфікацыі індывіда, устойлівая сістэма ўсвядомленых уяўленняў і ацэнак этнадыферэнцыраваных і этнаінтэграваных кампанентаў жыццядзейнасці этнасу. У адрозненне ад народнай самасвядомасці (мясцовай, сацыяльнай, канфесійнай, этнічнай) нацыянальная самасвядомасць з'яўляецца сплавам розных самаідэнтыфікацый, якія фарміруюцца на базе спецыфічных адносін этнічных суб'ектаў да унікальных асаблівасцей этнакультурнага свету. Таму кампанентная структура нацыянальнай самасвядомасці выглядае надзвычай складанай. Шматлікасць падыходаў да яе структурызацыі вядзе і да разнастайнасці педагагічных поглядаў на яе фарміраванне. Вызначальнымі ў фарміраванні гэтага віду самасвядомасці для нашага дысертацыйнага даследавання з'яўляюцца: атрыманне ведаў аб сутнасці нацыянальнага жыцця (кагнітыўны аспект), узмацненне нацыянальных па змесце пачуццяў (афектыўны аспект), далучэнне і ўключэнне асобы ў нацыянальныя па змесце віды дзейнасці (канатыўны аспект). Дзейнасць аматарскіх мастацкіх калектываў дазваляе комплексна выкарыстоўваць гэтыя тры галоўныя складаючыя. Асаблівую ўвагу педагогаў-даследчыкаў прыцягвае падлеткавы ўзрост. Працягнуты ў часе працэс фарміравання нацыянальнай самасвядомасці залежыць ад многіх фактараў, у тым ліку і ад агульнага ўзроўню псіхічнага развіцця асобы. Падлеткавы ўзрост з'яўляецца сензітыўным перыядам фарміравання ідэнтычнасці, этнічнай таксама, дзе назапашаны асобай сацыяльны вопыт існавання ў пэўнай этнасацыяльнай супольнасці складваецца ў сістэму. Менавіта пільная ўвага з боку старэйшых у гэтым узросце дае магчымасць прасачыць кірунак яе фарміравання, ажыццявіць своечасовую карэкцыю [3, 4].

2. Фальклор адыграў важнейшую ролю ў станаўленні беларускай нацыі: пры яго дапамозе выпрацоўвалася і сцвярджалася нацыянальная ідэя, фарміруючы тым самым этнічны від самасвядомасці народа. Фальклор і сёння застаецца магутным сродкам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці



асобы. Ён паўстае як нацыянальная каштоўнасць, падмурак нацыянальнай культуры, адбітак гістарычнай спадчыны беларускага народа, гарант захаванасці нацыянальнай своеасаблівасці беларускай культуры і нацыянальнай мовы. Гэтую ролю фальклор адыгрывае дзякуючы асаблівым характарыстыкам, якія ўвасобіліся ў асноватворных яго прыметах – у калектыўнасці, унутрысітуацыйнасці, сінкрэтызму, варыянтнасці, вуснасці, традыцыйнасці. Менавіта яны дапамаглі данесці да нашых дзён у творах традыцыйнага і сучаснага фальклору самасвядомасць розных этапаў развіцця этнічнай супольнасці, пачынальна ад стадыі родаплемянных адносін і да яе нацыянальнай формы [1].

3. Далучэнне асобы да традыцыйнай народнай творчасці ва ўмовах сучаснага беларускага грамадства, забеспячэнне яе этнічнай самарэалізацыі, можа адбыцца праз арганізаванае мастацкае аматарства фальклорнага кірунку. Але для мэтанакіраванага фарміравання нацыянальнай самасвядомасці яе ўдзельнікаў недастаткова ўплыву толькі аднаго вобразнага слова народнай творчасці, пры дапамозе якога нібы ўсвядомяцца ідэі дабра, маральныя каштоўнасці, прынцыпы, эстэтычныя пачуцці і другія запаведзі народнага жыцця. Выхаваўчы патэнцыял фальклору значна ўзрастае пры стварэнні неабходных педагагічных умоў для рэалізацыі ў дзейнасці мастацкага аматарскага калектыву фальклорнага кірунку канстытуцыйных прымет фальклорнай творчасці. Гэта дазваляе пашырыць і ўдакладніць кампанентную структуру педагагічнага патэнцыялу фальклору, больш поўна ўсвядоміць яго адрозненне ад педагагічнага патэнцыялу арганізаванага аматарства фальклорнага кірунку. Іх агульныя рысы абумоўлены падабенствам мастацка-творчай дзейнасці, але яны не тоесныя: з акадэмізацыяй формаў мастацка-творчай працы педагагічны патэнцыял фальклору губляецца [6; 3; 9].

4. Даследаванне нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў эксперыментальных мастацкіх калектываў паказала, што ў фальклорных ансамблях узровень сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці асобы не вышэйшы за ўзровень нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў, якія не займаюцца ў фальклорных групах. Мы выявілі, што сярод апытаных удзельнікаў фальклорных калектываў вельмі мала падлеткаў з высокім узроўнем нацыянальнай самасвядомасці, якія вылучаюцца гарманічным спалучэннем усіх яе кампанентаў (18%). Вялікую частку ўдзельнікаў названых калектываў (54%) складаюць падлеткі, якія маюць нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці, а (28%) рэспандэнтаў маюць сярэдні ўзровень. Атрыманыя дадзеныя сведчаць, што самі па сабе заняткі ў аматарскім калектыве фальклорнага кірунку не прыводзяць да аўтаматычнага фарміравання ў падлеткаў нацыянальнай самасвядомасці. Патрабуецца мэтанакіраваная выхаваўчая праца з імі. Значна павысіць эфектыўнасць працэсу фарміравання



Рэпазіторый БДУКІ

нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах магчыма пры стварэнні наступных педагагічных умоў: а) максімальная імітацыя канстытуцыйных прымет існавання фальклорнай культуры (унутрысітуацыйнасць, традыцыйнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм, вуснасць) у вучэбна-творчым працэсе калектываў дзеля атрымання эфекту паглыблення ўдзельніка ў фальклорную культуру і рэалізацыі педагагічных магчымасцей фальклору; б) уцягванне ўдзельнікаў у грамадска-значныя, нацыянальныя па змесце, справы мастацкага аматарскага калектыву фальклорнага кірунку, фарміраванне ў падлеткаў станоўчых адносін да гэтых спраў і іх актыўны ўдзел у мерапрыемствах [7; 8].

5. Методыка фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў мастацкім аматарскім калектыве фальклорнага кірунку будуецца на разуменні ўзроставых асаблівасцей падлеткаў, спецыфікі існавання фальклору ў сучасных сацыякультурных умовах, спецыфікі мастацка-адукацыйнага працэсу аматарскага калектыву. Яна скіравана першым чынам на стварэнне ўмоў для фарміравання ў асобы этнічнай карціны свету, парадыгмы народнай культуры, усведамлення яе зместу і каштоўнасці. Рэалізуецца ў мэтавым, змястоўным, працэсуальным і рэзультатыўным аспектах мастацка-педагагічнай дзейнасці аматарскага калектыву.

Мэтавы аспект вызначае генеральныя задачы методыкі – стварэнне ўмоў для фарміравання і развіцця нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў аматарскага калектыву сродкамі фальклору ў мастацкай творчасці. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці прадугледжвае, па-першае, фарміраванне яе кагнітыўнага кампанента (веданне аб этнакультурных і этнапсіхалагічных асаблівасцях свайго народа), па-другое, фарміраванне эмацыянальна-каштоўнаснага кампанента (этнакультурных і этнапсіхалагічных запатрабаванняў, матываў, інтарэсаў), па-трэцяе, фарміраванне рэгулятыўнага кампанента (дзейнасці, паводзін).

Змястоўны аспект методыкі рэалізуецца ў мастацка-творчай дзейнасці калектыву і звязаны з увядзеннем этнарэгіянальных кампанентаў, падсістэм этнічнай культуры: вытворчым кампанентам жыццезабеспячэння (вопратка, жыллё, ежа), сацыянарматыўным (этнічны светапогляд, норавы, традыцыі, звычаі і абрады, рэлігія і вераванні), пазнавальным (нацыянальная мова, гісторыя свайго народа, роднай краіны, народная творчасць, нацыянальная літаратура і мастацтва).

Працэсуальны аспект разумее пад сабою сістэму формаў, сродкаў, метадаў фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў аматарскага калектыву: даступнасць інфармацыі па этнічных асаблівасцях свайго народа, далучэнне ўдзельнікаў да дасягненняў і набыткаў свайго народа (наведванне краязнаўчых музеяў, нацыянальных выстаў, нацыянальных тэатраў і калектываў), правядзенне сустрэч з творчай інтэлігенцыяй, навуковымі супрацоўнікамі, носьбітамі фальклорнай культуры, арганізацыя і ўдзел у нацыянальных святах і абрадах, укараненне нацыянальных традыцый у калектыў; міжкультурная праграма, напраўленая на разуменне адрозненняў і на ўсведамленне падабенства культур, адзінства агульначалавечых каштоўнасцей.



Рэзультатыўны аспект вызначаецца вынікам станаўлення нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў – удзельнікаў аматарскіх калектываў мастацкай творчасці, фарміравання ўласцівасцей і якасцей, якія спрыяюць аптымальным міжэтнічным узаемаадносінам і ўзаемадзеянням. Гэта вывучэнне дасягнутага ўзроўню сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці і праектаванне далейшай работы па яе фарміраванні [5; 6; 7].

Мэтазгоднасць укаранення і прадуктыўнасць распрацаванай методыкі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскім калектыве мастацкай творчасці пацвярджасцца станоўчай дынамікай зрухаў у нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў.

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Практычная (эканамічная, сацыяльная) значнасць атрыманых вынікаў прадстаўлена магчымасцю рэалізацыі методыкі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх калектывах мастацкай творчасці, што пацвярджаецца актамі ўкаранення ў практыку работы фальклорнага ансамбля "Весялінка" сярэдняй школы № 116 г. Мінска, фальклорнага ансамбля "Чобаты" Ваўкавыскага РДК Гродзенскай вобласці. Асобныя палажэнні методыкі ўкаранёны ў практыку вучэбна-творчага калектыву "Валачобнікі" Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, Народнага ансамбля народнай песні "Крыніца" РЦКіНТ г. Слаўгарада Магілёўскай вобласці. Акты ўкаранення дадаюцца.

Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваюцца ў лекцыйным курсе "Методыка работы з фальклорным калектывам", ужываюцца ў практычных занятках па дысцыплінах "Харавы клас", "Выканальніцкае майстэрства" і "Гуртавыя спевы" вучэбнага працэсу Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, у спецкурсах Мазырскага філіяла БДУ культуры і мастацтваў.

Атрыманыя вывады будуць карыснымі для кіраўнікоў аматарскіх калектываў мастацкай творчасці пры распрацоўцы ўласнай сістэмы работы па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці іх удзельнікаў, для кіраўнікоў сацыяльна-культурных устаноў усіх тыпаў, для кіраўнікоў устаноў адукацыі пры вырашэнні пытання ўдасканалення працэсу ідэалагічнага і патрыятычнага



Рэпазіторый БГУКИ

выхавання падрастаючага пакалення з выкарыстаннем нацыянальна-культурнай, фальклорнай спадчыны.

Даследаванне не вычэрпвае ўсіх аспектаў праблемы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы. Трэба больш увагі надаць праблеме вымярэння яе сфарміраванасці, бо прыведзеная ў даследаванні сістэма вымярэння мае свае недахопы. Перспектыўным бачыцца даследаванне ўздзеяння выхаваўчага патэнцыялу фальклору, яго магчымасцей у фарміраванні цэласнай і гарманічнай асобы не толькі ў мастацка-педагагічным працэсе аматарскіх мастацкіх калектываў, але і вучэбна-выхаваўчым працэсе агульнаадукацыйных сярэдніх, спецыяльных і вышэйшых устаноў.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навуковых журналах


1 Ражкова, Л.Л. Фальклор як сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці / Л.Л. Ражкова // Адукацыя і выхаванне. – 2002. – № 4. – С. 63–66.

2 Ражкова, Л.Л. Да пытання аб педагагічным патэнцыяле фальклору / Л.Л. Ражкова // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 3. – С. 46–49.

3 Ражкова, Л.Л. Нацыянальная самасвядомасць падлеткаў – удзельнікаў фальклорна-сцэнічных калектываў / Л.Л. Ражкова // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2004. – № 5. – С. 25–37.

4 Ражкова, Л.Л. Фарміраванне этнічнай самасвядомасці асобы: метадалогія даследавання / Л.Л. Ражкова // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава. – 2007. – № 4(46). – С. 43–48.


### Матэрыялы навуковых канферэнцый


5 Ражкова, Л.Л. Патрыятычнае выхаванне падлеткаў у працэсе фальклорна-этнаграфічнай працы / Л.Л. Ражкова // Теория и практика нравственного воспитания: история, современность, перспективы : материалы междунар. науч. конф., Мозырь, 22–23 октября 1998 г. : Министерство образования РБ, Мозырьский гос. пед. ин-т; редкол.: В.С. Болбас [и др.]. – Мозырь, 1998. – С. 97–99.

6 Ражкова, Л.Л. Элементы фальклорнай спадчыны ўсходніх славян у рэпертуары фальклорных калектываў Беларусі / Л.Л.Ражкова // Восточнославянское единство в прошлом, настоящем и будущем : материалы междунар. молодеж. науч. конф., Гомель, 1998 г. / Белорус. гос. ун-т транспорта, О-во Кирилла Туровского, Гомель. науч. центр им. Кирилла Туровского, Гомель. общественно-культур. центр; редкол.: В.И. Коваль [и др.]. – Гомель, 1998. – С 85–86.

7 Ражкова, Л.Л. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы ў навучальна-выхаваўчым працэсе гурткоў фальклорнага накірунку / Л.Л. Ражкова // Культура Беларусі: навуковы пошук моладзі : матэрыялы навук. канф. аспірантаў, Мінск, 14 мая 1997 г. / Бел. ун-т культуры; рэдкал.: А.У. Пазнякоў [і інш.]. – Мінск, 1999. – Ч. 2. – С.132–135.

8 Ражкова, Л.Л. Некаторыя пытанні фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў дзіцячых фальклорных гуртоў / Л.Л. Ражкова // Перспектыўныя накірункі фарміравання духоўнай і мастацкай культуры студэнтаў : матэрыялы навук. канф., Мінск, 22–23 красавіка 1998 г.


Репозиторий БГУКИ

/Міністэрства культуры РБ, Бел. ун-т. культуры; рэдкал.: П.Р. Ігнатовіч [і інш.]. – Мінск, 2000. – С.132–136.

9 Ражкова, Л.Л. Шляхі ўдасканалення працэсу развіцця нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў фальклорных калектываў / Л.Л. Ражкова // Нацыянальная спадчына і сучасныя праблемы культуры : даклады, прачытаныя на XXIX канф. студэнтаў і аспірантаў БДУК, прысвечаныя 60-годдзю вызвалення Беларусі, Мінск, 22–23 красавіка 2004 г. / БДУ культуры і мастацтваў; рэдкал.: М.А.Бяспалая [і інш.].– Мінск, 2004. – С. 245–251. – Дэп. у ДУ "БелІСА" 30.06.2004, № Д200469.



## РЭЗЮМЭ

**Ражкова Людміла Леанідаўна**

**Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах**

**Ключавыя словы:** фарміраванне, нацыянальная самасвядомасць асобы, падлеткі, аматарскі мастацкі калектыў, сацыякультурная дзейнасць, фальклор, методыка фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы.

**Мэта** даследавання – распрацоўка тэарэтычных і метадычных асноў фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах.

**Метады:** гістарыяграфічны аналіз, параўнанне, класіфікацыя, мадэляванне, уключанае назіранне, анкетаванне, інтэрв'юіраванне, гутарка, аналіз дзейнасці аматарскіх калектываў фальклорнага кірунку, вывучэнне і аналіз педагагічных сітуацый і вопыту, педагагічны эксперымент, метады матэматычнай статыстыкі.

**Атрыманыя вынікі, іх навізна:** удакладнена паняцце "нацыянальная самасвядомасць асобы" і выяўлены педагагічныя падыходы да яго фарміравання ў падлеткаў, вызначана кампанентная структура педагагічнага патэнцыялу фальклору і абгрунтавана роля канстытуцыйных прымет фальклору ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці асобы, раскрыта спецыфіка мастацка-педагагічнай дзейнасці аматарскіх калектываў у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў-удзельнікаў, вызначаны педагагічныя ўмовы павышэння эфектыўнасці працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскім мастацкім калектыве, распрацавана і апрабавана методыка яго фарміравання.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні**

Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны кіраўнікамі аматарскіх мастацкіх калектываў, кіраўнікамі сацыякультурных устаноў, кіраўнікамі ўстаноў адукацыі пры вырашэнні пытання ўдасканалення ідэалагічнага і патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення на аснове фальклору, у працэсе вывучэння спецыяльных дысцыплін па спецыялізацыі "харавая музыка (народная)" Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

**Галіна выкарыстанн** – этнапедагогіка, педагогіка сацыякультурнай дзейнасці, практыка арганізаванага мастацкага аматарства.

Репозиторий БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

**Рожкова Людмила Леонидовна**
**Формирование национального самосознания подростков средствами фольклора в любительских художественных коллективах**

**Ключевые слова:** формирование, национальное самосознание личности, подростки, любительский художественный коллектив, социокультурная деятельность, фольклор, методика формирования национального самосознания личности.

**Цель** исследования – разработка теоретических и методических основ формирования национального самосознания подростков средствами фольклора в любительских художественных коллективах

**Методы:** историографический анализ, сравнение, классификация, моделирование, включенное наблюдение, анкетирование, интервьюирование, беседа, анализ деятельности любительских коллективов фольклорного направления, изучение и анализ педагогических ситуаций и опыта, педагогический эксперимент, методы математической статистики.

**Полученные результаты, их новизна:** уточнено понятие «национальное самосознание личности» и выявлены педагогические подходы к его формированию у подростков, определена компонентная структура педагогического потенциала фольклора и обоснована роль конституционных признаков фольклора в формировании национального самосознания личности, раскрыта специфика художественно-педагогической деятельности любительских коллективов в формировании национального самосознания подростков–участников, определены педагогические условия повышения эффективности процесса формирования национального самосознания подростков средствами фольклора в любительских художественных коллективах, разработана и апробирована методика его формирования.

**Рекомендации по использованию**

Материалы исследования могут быть использованы руководителями художественных любительских коллективов, руководителями социокультурных учреждений, руководителями учреждений образования при решении вопроса совершенствования идеологического и патриотического воспитания подрастающего поколения на основе фольклора, в процессе изучения специальных дисциплин по специализации «хоровая музыка (народная)» Белорусского государственного университета культуры и искусств.

**Область использования** – педагогика социокультурной деятельности этнопедагогика, практика организованного любительского творчества.



## SUMMARY

**Rojkova Lioudmila Leonidovna**

**Formation of Teenagers National Self-consciousness by Folklore Means in Amateur Art Groups**

**Key words:** formation, person' national self-consciousness, teenagers, amateur art group, sociocultural activity, folklore, methods of formation of the person's national self-consciousness.

**The object** of study is the development of theoretical and methodical fundamentals of formation of teenagers national self-consciousness by folklore means in amateur art groups.

**Methods:** historiographic analysis, comparison, classification, modeling, included observation, questionnaire design of amateur groups participants, students, interviewing, talks with leaders, pedagogues, parents, participants, analysis of activity of amateur groups of folklore school, study and analysis of pedagogical situations and experience, pedagogical experiment, mathematical statistics methods.

**Received results, their novelty:** the notion "person's national self-consciousness" is revealed and pedagogical approaches to its formation in teenagers are shown, the competent structure of folklore pedagogical potential is determined, the role of folklore constitutional features in formation of the person's national self-consciousness is proved, the specific character of the artistic and pedagogical activity of amateur groups in the formation of national self-consciousness of teenagers-participants is revealed, pedagogical conditions of increasing the formation process efficiency of teenagers national self-consciousness by folklore means in an amateur art group are determined, methods of its formation are developed and approved.

**Recommendations for use** The research materials can be used by the leaders of artistic amateur teams, chiefs of sociocultural institutions, chiefs of educational establishments when solving the matter of improvement of the ideological and patriotic education of the growing generation on the basis of folklore, in the process of study of special disciplines in the specialization "Chorus music, folk music" of Belarusian University of Culture and Arts.

**Field of use** – pedagogy of sociocultural activity, ethnopedagogy, practice of organizational amateur creation.



Репозиторий БГУКИ

Навуковае выданне

**Ражкова Людміла Леанідаўна**

**ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ПАДЛЕТКАЎ СРОДКАМІ ФАЛЬКЛОРУ Ў АМАТАРСКІХ МАСТАЦКІХ КАЛЕКТЫВАХ**

Аўтарэферат

дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

---

Падпісана ў друк 15.10.2007. Фармат 60×84 $^1/_{16}$
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,45. Ул.-выд. арк. 1,32.
Заказ № 360. Тыраж 60 экз.

---

УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
220007, Мінск, вул. Рабкораўская, 17

---

Надрукавана на рызографе
УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
220007, Мінск, вул. Рабкораўская, 17

Репозиторий БГУКИ